значительно ускоряя процесс оценки. В этом основные преимущества электронного тестирования.

---

1. *Беспалько, В.П.* Образование и обучение с участием компьютеров: (педагогика третьего тысячелетия) / В.П. Беспалько. – М.: МПСИ; Воронеж: НПО «МОДЭК», 2002. – 348 с.; *Радьков, А.М.* Инновации в высшей школе / А.М. Радьков // Проблемы образования. – 2004. – №1(10). – С. 20–24; *Матвеев, А.М.* От электронных учебных пособий к электронным учебно-методическим комплексам / А.М. Матвеев // Вышэйшая школа. – 2007. – № 5. – С.73–76.

2. *Оськин, А.Ф.* Информационная образовательная среда поддержки управляемой самостоятельной работы студентов / А.Ф. Оськин // Вышэйшая школа. – 2007. – № 5. – С. 69.

3. *Колесников, А.Р.* Организация и учебно-методическое обеспечение контроля самостоятельной работы // Вышэйшая школа. – 2005. – № 5. – С. 68.

**А.М. Шаройка**, *выкладчык*

## СТАН І ПРЫЯРЫТЭТЫ Ў АРГАНІЗАЦЫІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

(кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры)

Змены, якія адбываюцца ў вучэбным працэсе ва ўсіх ВНУ краіны, у тым ліку і нашага універсітэта, выкліканы агульнымі патрабаваннямі да рэфармавання вышэйшай школы ў кірунку індывідуалізацыі навучання, пашырэння самаадукацыі, фарміравання патрэбнасці валодаць узрастаючым аб'ёмам інфармацыі і ўменнямі шукаць неабходную інфармацыю, апрацоўваць і прымяняць у прафесійнай дзейнасці. Адпаведна пашыраецца ў навучанні роля самастойнай работы, разнастайнымі становяцца яе формы, спосабы арганізацыі, тэхнічнае і метадычнае забеспячэнне.

Так, у цяперашні час на кафедры выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай работы: рэферат, рэфератыўны агляд часопіса, даклад, выступленне на семінары, разгорнутае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апаніраванне па тэарэтычных паведамленнях, канспекты артыкулаў, параграфаў, кніг, канспект даклада (рэферата), кантрольная праца, эсэ на праблемную тэму, даследчыцкія і творчыя заданні, анатаванне манаграфій, заняткі ў архівах, музеях, курсавы і дыпломны праекты. Да спецыфічных формаў адносяцца індывідуальная работа студэнтаў па вывучэнні музычных твораў (прафілізацыя "музычны інструмент"), праслухоўванне аўдыёзапісаў музычных твораў (прафілізацыя "музычны інструмент"), прагляд візуальнага матэрыялу ("гісторыя выяўленчага мастацтва"), самастойнае вывучэнне музычна-тэарэтычнага матэрыялу, рэцэнзаванне літаратурных крыніц, праслухоўванне музычных твораў ("гісторыя музыкі", прафілізацыя "музычны інструмент"), аналіз кінатвораў, спектакляў і твораў выяўленчага мастацтва ("гісторыя кіно", "гісторыя тэатра", "гісторыя выяўленчага мастацтва"), падрыхтоўка паэтычных вечароў, музычных гасцёўняў, канцэртаў ("арганізацыя мастацкай творчасці"). Асобныя формы (падрыхтоўка паэтычных вечароў і інш.) маюць групавы характар, аднак ацэньваюцца яны індывідуальна.

Мяняюцца таксама не толькі формы, але і функцыі, і прызначэнне кантролю. Кантроль – не толькі адзнака, прысуд, але і знак, паказчык таго, на што трэба звярнуць увагу і што дапрацаваць, у якім кірунку рухацца далей, каб адпаведна здольнасцям найлепей рэалізаваць сябе ў прафесіі.

У сувязі з гэтым сама арганізацыя самастойнай работы адбываецца па рэйтынгавай сістэме, у адпаведнасці з якой залік і экзаменацыйная адзнака залежаць ад сумы балаў, атрыманых на занятках. Не толькі колькасна, але і якасна робяцца разнастайнымі формы кантролю: бягучыя і выніковыя залікі і экзамены; праверка рэфератаў, дакладаў, кантрольных работ, віктарын (па музыцы, выяўленчым мастацтве і кіно), рэцэнзій, справаздач аб праходжанні практыкі і інш.; калёквіумы; тэсціраванне; абарона курсавых, дыпломных, магістэрскіх работ. Матэрыялы выкананых на высокім узроўні дакладаў (рэфератаў, кантрольных работ), вынікі навуковых даследаванняў студэнтаў актыўна ўключаюцца выкладчыкамі кафедры ў вучэбны працэс. Праблемы, якія даследуюцца ў студэнцкіх навуковых працах, уключаюцца ў курсы лекцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантраляваць дзейнасць студэнта лепей на занятках па дысцыпланах, якія накіраваны на ўдасканаленне атрыманых раней практычных навыкаў. Так, па дысцыплінах "Курсы базавай адукацыі" (для спецыяльнасці "культуралогія") і "Спецпрактыкум" (для спецыяльнасці "мастацтвазнаўства" – музычны інструмент, тэхніка мовы, жывапіс, малюнак), якія выкладаюцца з I па IX семестр, пры ажыццяўленні бягучага кантролю магчыма своечасовая карэкцыя працэсу навучання, накіраваная на выпраўленне памылак.

Існуе праблема метадычнага пазааўдыторнага забеспячэння самастойнай работы, аднак паступова яна вырашаецца. Аптымальным метадычным забеспячэннем самастойнай работы з'яўляецца сістэма вучэбна-метадычнага комплексу, якая накіравана на цэласнасць вучэбнага працэсу ў сукупнасці ўсіх яго частак. Уяўляецца мэтазгодным пераход на электронныя выданні, але для яго ажыццяўлення павінна быць прадумана сістэма абароны аўтарскіх правоў. Перспектыўным лічыцца і павелічэнне магчымасцей у выкарыстанні Internet-рэсурсаў, што садзейнічае ўдасканаленню і пашырэнню ў адукацыйным працэсе дыстанцыйнай формы навучання, стымулюе распрацоўку электронных падручнікаў, праграм для навучання, праграм-трэнінгаў.

Абавязковым для арганізацыйна-метадычнага забеспячэння самастойнай работы з'яўляецца развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы факультэта. Выкладчыкі павінны ўлічваць пры планаванні самастойнай работы наяўнасць у бібліятэках дастатковай колькасці вучэбнай, вучэбна-метадычнай, манаграфічнай літаратуры. Правядзенне індывідуальных і ў малых групах заняткаў са студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі пажадана праводзіць у спецыяльна выдзеленых памяшканнях (напрыклад, для прагляду кіна- і відэаматэрыялаў).

Усё вышэйсказанае тычыцца рашэння галоўнай задачы – не толькі навучыць пэўным ведам, але і навучыць вучыцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ